2. *Лапо, П.* Обзор деятельности библиотек учреждений высшего образования Республики Беларусь в 2012 г.: состояние и перспективы / П. Лапо, О. Баньковская // Бібліятэчны свет. – 2013. – № 3. – С. 15–20.

3. *Лапо, П. М.* Университетская библиотека в качестве проводника информационной культуры в современном обществе / П. М. Лапо // Медиа- и информационная грамотность в обществах знания / сост. Е. И. Кузьмин, А. В. Паршакова. – М. : МЦБС, 2013. – С. 368–372.

4. Основные показатели деятельности библиотек учреждений высшего образования Республики Беларусь за 2013 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.library.bsu.by/?vpath=/methodicalcentre/statistics/. – Дата доступа : 15.08.14.

5. *Фокеев, В. А.* Природа библиографического знания / В. А. Фокеев. – М. : Изд-во Рос. гос. б-ки, 1995. – 351 с.

6. *Шадрина, В. Н.* Библиографическая культура исследователя и педагогические методы ее формирования / В. Н. Шадрина ; Белгор. гос. ин-т культуры. – Белгород : Политерра, 2004. – 139 с.

***В. М. Сакалова,***
*саіскальнік вучонай ступені*
*кандыдата культуралогіі*

# ПАМЯЦЬ АБ ВЫБІТНЫХ ДЗЕЯЧАХ ЯК ЭЛЕМЕНТ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭІ

Паводле Э. Рэнана, галоўны капітал, на якім грунтуецца нацыянальная ідэя, – гераічнае мінулае, вялікія людзі і слава. Культ продкаў – на думку філосафа, самы законны з усіх, і менавіта продкі зрабілі нас такімі, якімі мы з’яўляемся ў сучасны момант («Што такое нацыя?», 1882) [4]. Такім чынам, славутыя асобы – адзін са складнікаў нацыянальнай ідэі, без асэнсавання якой немагчыма паўнавартаснае жыццё любога народа. Веданне і шанаванне продкаў важна для людзей, якія займаюцца самасвядомасцю, спрабуюць сябе ідэнтыфікаваць.

Асэнсаванне культуры як прасторы ўласных імёнаў закранае аспекты ўключэння выбітных асоб розных эпох у кантэкст сучаснасці. Рэканструкцыя жыцця славутых айчынных дзеячаў – адзін з важных сродкаў супрацьстаяння забыццю, які спрыяе захаванню нацыянальнай ідэнтычнасці.

Складванне нацыянальнай ідэі не можа абысціся без вобраза той ці іншай знакавай асобы, ключавога імя, якое прысутнічае ў месцах памяці: на гарадскіх і вясковых вуліцах у жанравай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скульптуры, помніках, памятных знаках, гадонімах – і ментальна звязвае беларусаў са сваёй гісторыяй.

У кожнага месца, як вядома, ёсць Spirit of place – дух-заступнік, які стварае і дбайна засцерагае яго непаўторную атмасферу. У г. Маладзечна такі геній месца – Міхал Клеафас Агінскі, памяць аб якім замацавана на мемарыяльнай дошцы Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа, што носіць яго імя, у помніку кампазітару каля каледжа (скульпт. В. Янушкевіч), у назве мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» і г. д. Імя выдатнага дзеяча Міхала Клеафаса Агінскага ўпісана ў гісторыю Маладзечна, складае ўнікальнасць горада, яго памяць, гонар, як і гонар краіны.

У г. Мінску захоўвае атмасферу губернскага горада Караль Чапскі, гарадскі галава ў 1890–1901 гг., самы вядомы і паважаны жыхарамі.

Традыцыяй увядзення ключавых імёнаў у прастору сучаснага горада становіцца святкаванне дня нараджэння знакавай асобы.

15 жніўня 2014 г. на будынку мінскага піваварнага завода «Аліварыя» адкрылі памятны барэльеф (скульпт. П. Вайніцкі) у гонар Караля Чапскага, а 15 жніўня 2015 г. у г. Мінску шырока адзначаўся Дзень Чапскага (ChapskyDay). Графа – пераўтваральніка горада – назвалі мінчанінам стагоддзя. Па горадзе ездзіў «трамвай Чапскага», у якім можна было паглядзець фатаграфіі і пачуць аўдыяфакты з эпохі графа, а ўвечары ў многіх кафэ горада – прадэгуставаць піва. Вобраз Караля Чапскага можна ўбачыць і ў творах стрыт-арту на вул. Кастрычніцкай.

1 жніўня 2015 г. на пл. Свабоды адбылося адкрыццё мемарыяльнай дошкі ў гонар 250-годдзя М. К. Агінскага. Пасля цырымоніі былі арганізаваны канцэрт ансамбля старадаўняй музыкі «Кантабіле» і прэзентацыя праекта «Эпоха князя Міхала Клеафаса» з касцюміраваным, стылізаваным балем XIX ст., гучала музыка як самога кампазітара, так і яго настаўнікаў і паслядоўнікаў. Раней, у чэрвені, тут была ўсталявана музычная лаўка, стылізаваная пад герб роду Агінскіх.

25 верасня 2015 г. святкавалі дзень нараджэння М. К. Агінскага ў гарадах Маладзечна і Залессе. Да значнай падзеі быў прымеркаваны паказ оперы «Міхал Клеафас Агінскі. Невядомы партрэт» (камп. А. Залётнеў), створанай для пастаноўкі Маладзечанскім маладзёжным музычным народным тэатрам (прэм’ера адбылася ў 2013 г.).

Памяць аб выбітных дзеячах – складальнік нацыянальнай ідэі, здольны кансалідаваць беларусаў у нацыю і вылучыць сярод іншых нацый. Духоўныя брэнды, увасобленыя ў вобразах знакавых асоб, аб'ядноўваюць нацыю, падкрэсліваюць яе самабытнасць, з'яўляюцца прадметам гонару, дапамагаюць дастойна прадстаўляць краіну на міжнародным узроўні, спрыяюць дыялогу паміж культурамі, замацаванню пазітыўнага іміджа Беларусі ў свеце.

Ключавыя імёны важныя для культурнай памяці краіны, яны акумуліруюць інфармацыю пра яе гісторыю і культуру, захоўваюцца ў памяці як сімвалы культуры, валодаюць культурным патэнцыялам, фарміруючы ў прасторы гісторыка- і культуразначныя месцы памяці.

Праблемы змены тапаніміі, захавання гістарычных назваў, іх замацавання ў гарадской прасторы, пытанні культурна-гістарычнай каштоўнасці выклікаюць бесперапынныя дыскусіі ў грамадстве. Так, калі ў г. Маладзечна ў 1991–1994 гг. савецкія назвы вуліц змянілі на імёны беларускіх дзеячаў (вул. Энгельса – вул. І. Буйніцкага, вул. Калініна – вул. Я. Драздовіча, вул. Астроўскага – вул. К. Астрожскага) і назвы, звязаныя з гісторыяй Беларусі (пр-т Леніна – Вялікі Гасцінец, вул. Савецкая – вул. Віленская) [1], то ў сталіцы захаваліся гадонімы, абумоўленыя савецкім мінулым.

Сёння назіраецца тэндэнцыя называць вуліцы ў мікрараёнах, на ўскраінах г. Мінска ў гонар вядомых беларусаў, што сведчыць аб паступовым замацаванні беларускага складніка культуры ў гарадской прасторы. Напрыклад, да вуліц Напалеона Орды, Ежы Гедройца і Яна Чачота ў мікрараёне Брылевічы дадалася вул. Сцяпана Некрашэвіча, беларускага вучонага-мовазнаўцы, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; у мікрараёне Міхалова – вул. Льва Сапегі, у раёне Вялікая Сляпянка – вул. Ваньковіча і вул. Буйніцкага. У 2014 г. у мікрараёне Міхалова-2 вуліцы названы ў гонар дзяржаўных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага князёў Астрожскіх і графскага роду Тышкевічаў, самыя вядомыя прадстаўнікі якога Я. і К. Тышкевічы, археолагі, гісторыкі, этнографы, фалькларысты, заснавальнікі першага публічнага музея старажытнасцей у Беларусі. У сувязі з 200-гадовым юбілеем беларускага мастака Івана Хруцкага, які адзначаўся ў 2010 г., у наступным годзе яго імем была названа вуліца. Выяву самай вядомай карціны мастака «Партрэт незнаёмкі з кветкамі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і садавіной», выкананую Д. Післяком маркерамі для стрыт-арту, можна пабачыць на фасадзе дома па вул. Карла Маркса, 25. У 2011 г. з'явіліся вуліцы, названыя у гонар дырыжора і дзеяча харавога мастацтва Генадзя Цітовіча, перакладчыка Уладзіміра Дубоўкі, беларускага і літоўскага мастака Пятра Сергіевіча, беларускага і польскага пісьменніка Яна Баршчэўскага, пісьменніка, вучонага і дзяржаўнага дзеяча Івана Навуменкі; у 2015 г. новым вуліцам у мікраараёне Лошыца прысвоены імёны кінарэжысёраў, якія ўнеслі значны ўклад у станаўленне і развіццё беларускага кінамастацтва, Віктара Турава і Міхаіла Пташука.

Аб'яднанне нацыі праз выпрацоўку нацыянальнай ідэі немагчыма без ведання гістарычнага мінулага. На жаль, не вельмі добрае веданне сваёй гісторыі вядзе да памылковай ідэнтыфікацыі асоб і ў навуковых артыкулах, і ў сродках масавай інфармацыі, і ў грамадскай свядомасці. Так, у даследаванні Ю. Л. Нікіцінай і В. А. Стаднік памылкова адзначаецца, што вул. Янкоўскага ў г. Мінску атрымала назву ў гонар вядомага акцёра [3, с. 132], але на самай справе вуліца носіць імя беларускага мовазнаўцы, заснавальніка беларускай фразеалогіі. У сетцы Інтэрнэт можна сустрэць тлумачэнне наймення вул. Дарашэвіча ў гонар рускага журналіста, фельетаніста канца XIX – пачатку XX ст. Уласа Дарашэвіча [6], што лагічна вытлумачальна, бо побач размяшчаюцца вул. Хмяльніцкага і вул. Чарнышэўскага. Аднак вуліца названа ў гонар беларускага вучонага-геадэзіста, рэктара Беларускага дзяржаўнага політэхнічнага інстытута ў 1947–1959 гг. М. В. Дарашэвіча (адзін з карпусоў БНТУ знаходзіцца побач з вул. Дарашэвіча). Вул. Караткевіча у многіх выклікае асацыяцыю з імем класіка беларускай літаратуры, але яна носіць імя аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў Мінскага падполля, вядомага пад псеўданімам Дзіма.

У якасці прыкладу недакладнай ідэнтыфікацыі вядомых асоб у жыхароў горада можна прывесці выказванне аднаго з удзельнікаў абмеркавання аб назвах і перайменаванні вуліц г. Мінска на форуме tut.by: starushka.ru (11 кастрычніка 2012 г.): «Мая пажылая свякроў заявіла, што яна паехала ў краму на Банапарта. Гэта яна так сабралася ў «Ома», што на вул. Напалеона Орды. Ужо як гэтыя назвы не перакручваюць. Няўжо нельга прыдумаць нешта мілагучнае» [5]. Гэтыя прыклады можна працягваць і далей.

Замацаванне імёнаў культуры, аднясенне іх да ключавых імёнаў – працэс складаны, які патрабуе часу і пэўных практычных дзеянняў, прымянення эфектыўных гарадскіх практык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мэтах папулярызацыі значных персаналій, звязаных з Беларуссю, на нашу думку, неабходна на дзяржаўным узроўні здзейсніць праект «Сто выдатных беларусаў». Такія праекты былі ажыццёўлены ў Расіі і Украіне – праект «Імя Расіі» (2008), праект украінскага тэлебачання «Вялікія ўкраінцы» (2007–2008), зроблены па ўзору праекта «100 найвыдатнейшых брытанцаў»: выдадзены серыі кніг, прысвечаных найбольш папулярным гістарычным персанажам, створаны дакументальныя стужкі, падрыхтаваны серыі перадач на тэлебачанні, прайшло народнае галасаванне. Самым выдатным украінцам названы Яраслаў Мудры, а імем Расіі стала імя Аляксандра Неўскага.

У г. Мінску выдавецтва «Харвест» у 2012 г. распачало ажыццяўленне праекта, каардынатарам якога з'яўляецца беларускі гісторык А. Тарас. У серыі «100 выдатных дзеячаў», разлічанай на 10 гадоў, выдадзена 37 невялікіх кніг (па 64 старонкі кожная), прысвечаных дзеячам беларускай навукі і культуры, літаратуры, мастацтва XIX–XX стст.: мастакам Міхалу Андрыёлі, Івану Хруцкаму, Казіміру Малевічу, Напалеону Ордзе; тэатральным дзеячам Фларыяну Ждановічу, Ігнату Буйніцкаму, Францішку Аляхновічу; гісторыкам Мітрафану Доўнар-Запольскаму, Міколу Ермаловічу і інш.

Вынікі сацыялагічных даследаванняў, праведзеных Інстытутам сацыялогіі НАН Беларусі ў 2008–2009 гг., «Успрыманне насельніцтвам новых незалежных дзяржаў гісторыі і постсавецкага перыяду» і «Нацыянальная ідэнтычнасць беларусаў: хто мы і якімі будзем?» дазволілі зрабіць высновы, што найбольшым патэнцыялам для ўмацавання беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці валодае топас сацыяльных уяўленняў пра гісторыю Беларусі да пачатку XX ст., які характарызуецца пазітыўным успрыманнем у масавай свядомасці, і што дзейнасць вядомых асоб можа служыць аб'ядноўваючым фактарам у фарміраванні культурнай памяці беларусаў [2].

У беларускай гісторыі шмат выдатных фігур, якія патрабуюць даследавання і мемарыялізацыі ў кнігах, дакументальных і мастацкіх стужках, помніках, гарадской тапаніміцы – знаках і месцах памяці, складніках непаўторнай нацыянальнай культуры. Свядомы зварот да мінулага дапамагае захаваць свае карані, спрые разуменню ўнікальнасці нацыянальнага шляху ў агульным культурным руху.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Как переименовывали молодечненские улицы в первой половине 90-х? // vMolo.by : Молодечно в Интернете [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://vmolo.by/news/kak-pereivine-90-x. – Дата доступа : 01.10.2015.

2. *Ластовский, А.* Специфика исторической памяти в Беларуси: между советским прошлым и национальной перспективой / А. Ластовский // Вестник общественного мнения. – 2009. – № 4. – Полит.ру [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://polit.ru/article/2010/07/19/belorus/. – Дата доступа : 17.08.2015.

3. *Никитина, Ю. Л.* «Белорусский текст» культуры в урбанонимиконе г. Минска (на материале коммеморативных внутригородских названий) / Ю. Л. Никитина, В. А. Стадник // Язык и социум : материалы IX Междунар. науч. конф., 3–4 дек. 2010 г. : в 3 ч. – Минск : БГУ, 2011. – Ч. 2 / редкол.: Л. Ф. Гербик (отв. ред.). – С. 130–133.

4. *Ренан, Э.* Что такое нация? / Э. Ренан // Собр. соч. : в 12 т. : пер. с фр. / под ред. В. Н. Михайловского. – Киев, 1902. – Т. 6. – С. 87–101.

5. Тут говорят : форумы tut.by [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://talks.by/showthread.php?14086104&p=17629070#post 17629070. – Дата доступа : 17.08.2015.

6. Wikimapia : географическая онлайновая энциклопедия [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http: wikimapia.org/street/491145/ru. – Дата доступа : 01.10.2015.

***П. М. Сапотько,***
*магистр культурологии,*
*преподаватель кафедры*
*межкультурных коммуникаций*

## БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИЙ МЕЖКУЛЬТУРНЫЙ ДИАЛОГ: СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ

С 1992 г. Республика Беларусь и Литовская Республика все более активно стремятся развивать международное культурное сотрудничество в рамках двусторонней и европейской «повестки», многочисленных инициатив Европейского Союза в сфере профессионального искусства, любительского творчества, туристической деятельности, репрезентации исторического наследия обеих стран и т. д. Рассмотрим основные аспекты белорусско-литовского сотрудничества.

Реализуются совместные международные проекты на основе взаимодействия регионов Литвы и Беларуси с использовани-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ